

# ПАДЫХОДЫ ДА КАДЫФІКАЦЫІ ЮРЫДЫЧНАЙ ТЭХНІКІ

**Мікалай СІЛЬЧАНКА,**
доктар юрыдычных навук, прафесар,
прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

***Фармулююцца тэарэтыка-метадалагічныя і практычныя асновы кадыфікацыі юрыдычнай тэхнікі. З гэтай мэтай даследуюцца складнікі юрыдычнай тэхнікі – прыёмы, спосабы, метады складання актаў-дакументаў і актаў-дзеянняў, юрыдычныя сродкі, навыкі і ўменні, правілы юрыдычнай тэхнікі; вылучаюцца чатыры тыпы юрыдычнай тэхнікі – праватворчая, рэалізацыйная, сістэматызацыйная, інтэрпрэтацыйная; разглядаюцца папярэднія крокі да кадыфікацыі юрыдычнай тэхнікі.***

Юрыдычная тэхніка, як гэта выцякае з літаральнага разумення дадзенага словаспалучэння, складаецца з тэхнічных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца суб'ектамі права. Але паняцце «юрыдычная тэхніка» ў юрыспрудэнцыі мае больш шырокі змест і, акрамя тэхнічных сродкаў, ва ўласным сэнсе слова ўключае сродкі інтэлектуальныя, якія ў сферы права выконваюць роль, аналагічную функцыям тэхнічных сродкаў. У самым агульным плане юрыдычная тэхніка – гэта сістэма інтэлектуальных і матэрыяльных сродкаў, з дапамогай якіх ствараюцца адмысловыя па форме і змесце прававыя акты і ажыццяўляюцца аптымальныя дзеянні ў сферы права. Сёння назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя да замацавання лепшых узораў юрыдычнага інструментарыя ў дзеючым заканадаўстве, і таму важна ацаніць стан нарматыўнага прававога замацавання юрыдычнай тэхнікі, акрэсліць магчымыя крокі ў справе яе сістэматызацыі і наступнай кадыфікацыі. Для вырашэння дадзеных задач неабходна вызначыцца са складам юрыдычнай тэхнікі, яе тыпамі і відамі.

### *Склад юрыдычнай тэхнікі*

Юрыдычная тэхніка – паняцце, якое ўключае разнародныя элементы, якія тым не менш аб'ядноўваюцца ў адзінае цэлае.

Найперш, у склад юрыдычнай тэхнікі ўваходзіць сістэма выпрацаваных юрыдычнай навукай і практыкай *прыёмаў, спосабаў і метадаў*, з дапамогай якіх ствараюцца дасканалыя па форме і змесце прававыя акты, выконваюцца аптымальныя і эфектыўныя дзеянні ў сферы права [1, с. 7]. *Прыёмы* – гэта асобныя дзеянні, якія паўтараюцца пры стварэнні прававых актаў і ажыццяўленні прававой дзейнасці. *Спосабы* юрыдычнай тэхнікі ўтвараюцца з некалькіх прыёмаў, а пад *метадамі* юрыдычнай тэхнікі разумеюцца шляхі стварэння тэкстаў прававых актаў і ажыццяўлення юрыдычна значнай дзейнасці.

***Існуюць агульныя метады, спосабы і прыёмы, якімі карыстаюцца пры складанні ўсіх прававых актаў, і метады, спосабы і прыёмы, якія вылучаюцца да асобных відаў прававых актаў – у сферы праватворчасці, рэалізацыі, сістэматызацыі і інтэрпрэтацыі права. У гэтых варунках яны падзяляюцца на дзве групы – агульныя і спецыяльныя. У сваю чаргу, метады, спосабы і прыёмы, якія выкарыстоўваюцца пры ажыццяўленні дзеянняў у сферы права, таксама падзяляюцца мінімум на дзве групы – агульныя і спецыяльныя. Да агульных адносяцца прыёмы, спосабы і метады ажыццяўлення ўсіх дзеянняў у сферы права, а да спецыяльных – метады, спосабы і прыёмы, якія выкарыстоўваюцца пры стварэнні, рэалізацыі, сістэматызацыі і інтэрпрэтацыі прававых актаў.***

Самастойнай часткай юрыдычнай тэхнікі з'яўляюцца юрыдычныя *сродкі*, з дапамогай якіх суб'екты права ствараюць адмысловыя па форме і змесце прававыя акты і ажыццяўляюць аптымальныя і эфектыўныя дзеянні пры стварэнні, рэалізацыі, сістэматызацыі і інтэрпрэтацыі права. *Матэрыяльныя сродкі* – гэта камп'ютары, пісьмовыя прылады, друкавальная тэхніка, сродкі фіксацыі слядоў правапарушэнняў, правядзення разнастайных экспертыз і гэтак далей. *Інтэлектуальныя* сродкі – гэта найперш мова, на якой складаюцца тэксты прававых актаў, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца ў сферы права, навуковыя дадзеныя, правілы фармальнай логікі і падобныя да іх інтэлектуальныя і духоўныя здабыткі. Да сродкаў юрыдычнай тэхнікі выстаўляюцца асобныя патрабаванні, шэраг з якіх замацоўваецца ў праве. Напрыклад, мова прававых актаў павінна быць яснай, паняцці і тэрміны – дакладнымі і аднастайнымі.

Выкарыстанне матэрыяльных сродкаў спалучана з выкананнем тэхнічных правілаў (нормаў), частка якіх таксама замацоўваецца ў тэхнічных нарматыўных прававых актах.

***Метады, спосабы і прыёмы юрыдычнай тэхнікі ў сукупнасці з юрыдычнымі сродкамі ўтвараюць юрыдычны інструментарый, з дапамогай якога ажыццяўляюцца ўсе віды юрыдычна значнай дзейнасці.***

У змест паняцця юрыдычнай тэхнікі уключаюцца таксама веды і вопыт (навыкі і ўменні), якімі валодаюць сацыяльныя суб'екты ў справе стварэння адмысловых па змесце і форме прававых актаў, ажыццяўленні аптымальных і эфектыўных дзеянняў у сферы права. Юрыдычная тэхніка ўяўляе «…тот редкий феномен, где налицо «сплав» высокой юридической теории и сугубо прикладных практических проблем» [2, с. 5]. У гэтым зрэзе юрыдычная тэхніка разглядаецца ў якасці майстэрства, мастацтва. Цікава, што тэрмін «тэхніка» паходзіць ад адпаведнага грэчаскага слова і літаральна перакладаецца як «майстэрства, мастацтва» [3, с. 682].

Важную частку юрыдычнай тэхнікі складаюць *правілы юрыдычнай тэхнікі,* у якіх знаходзяць замацаванне ўсе структурныя часткі юрыдычнай тэхнікі: прыёмы, спосабы, метады стварэння актаў-дакументаў і ажыццяўлення актаў-дзеянняў, патрабаванні да сродкаў юрыдычнай тэхнікі, назапашаны вопыт у форме лепшых узораў складання прававых актаў і ажыццяўлення дзеянняў у сферы права, і таму правілы юрыдычнай тэхнікі можна разглядаць у якасці своеасаблівага люстэрка юрыдычнай тэхнікі. Заўважым, што размова ідзе не толькі аб правілах праватворчай тэхнікі, але і аб правілах рэалізацыі (у тым ліку прымянення права), сістэматызацыі і інтэрпрэтацыі права. Такі, можна сказаць, шырокі падыход да разумення правілаў юрыдычнай тэхнікі ўжо ў 50-я гады мінулага стагоддзя акрэсліў І.Л.Браудэ, які лічыў, што юрыдычная тэхніка павінна ахопліваць правілы аб характары, структуры і мове нарматыўных актаў, правілы тлумачэння прававых нормаў, тэхніку іх прымянення судовымі і адміністрацыйнымі органамі, структуру і форму судовых рашэнняў (прыгавораў) і адміністрацыйных актаў [4, с. 43].

### *Тыпалогія юрыдычнай тэхнікі*

Сказанае аб складовых частках юрыдычнай тэхнікі сведчыць аб іх знешняй субстратнай разнароднасці. Разам з тым юрыдычная тэхніка – гэта не суматыўны набор, а сістэма, хаця і living рознародных, але адзіных элементаў. Адзінства юрыдычнай тэхнікі праяўляецца ў тым, што кожная з частак юрыдычнай тэхнікі падпарадкавана агульнай мэце – распрацоўцы дасканалых па форме і змесце актаў-дакументаў і ажыццяўленню аптымальных і эфектыўных актаў-дзеянняў.

Адсюль выцякае, што на «вяршыні» юрыдычнай тэхнікі знаходзяцца метады, спосабы і прыёмы падрыхтоўкі тэкстаў прававых актаў і ажыццяўлення юрыдычна значных дзеянняў, таму дадзеныя элементы з'яўляюцца вядучымі, без іх юрыдычнай тэхнікі як адметнай з'явы не існуе. Дарэчы, разуменне юрыдычнай тэхнікі ў якасці асобнай прававой рэальнасці, якое звязваецца з Р.Іерынгам [5], пачалося менавіта з даследавання правілаў складання адмысловых па форме і змесце прававых актаў і захоўваецца сёння [6, с. 5]. Такім чынам, сродкі юрыдычнай тэхнікі, веды, навыкі і ўменні ў сферы права, правілы юрыдычнай тэхнікі ў функцыянальных адносінах падпарадкаваны прыёмам, спосабам і метадам падрыхтоўкі тэкстаў прававых актаў і ажыццяўленню дзеянняў у сферы права.

***У залежнасці ад характару і зместу прававых актаў, якія ствараюцца ў выніку юрыдычна значных дзеянняў, мы можам вылучыць асобныя тыпы і віды юрыдычнай тэхнікі. На наш погляд, юрыдычная тэхніка падзяляецца на чатыры тыпы: праватворчую тэхніку, тэхніку рэалізацыі права, тэхніку сістэматызацыі права і тэхніку інтэрпрэтацыі права. У сваю чаргу, у праватворчай тэхніцы мы можам вылучыць асобныя віды: заканадаўчую тэхніку, тэхніку стварэння дагавораў нарматыўнага зместу, тэхніку стварэння іншых відаў крыніц права. У праварэалізацыйным тыпе вылучаецца тэхніка прымянення, выкарыстання, выканання права і захавання права. У сістэматызацыйным тыпе вылучаецца тэхніка інкарпарацыі, кансалідацыі і кадыфікацыі права. Вылучаюцца асобныя віды і ў інтэрпрэтацыйным тыпе юрыдычнай тэхнікі.***

У юрыдычнай навуцы існуюць іншыя падыходы да класіфікацыі юрыдычнай тэхнікі. Так, Т.В.Кашаніна лічыць, што асноўным крытэрыем класіфікацыі юрыдычнай тэхнікі з'яўляюцца стадыі (этапы) прававога рэгулявання – праватворчасць, дзеянне права, рэалізацыю права – і выдзяляе шэсць відаў юрыдычнай тэхнікі: праватворчую тэхніку, тэхніку апублікавання нарматыўных актаў, тэхніку сістэматызацыі нарматыўных актаў, інтэрпрэтацыйную тэхніку, праварэалізацыйную тэхніку, правапрымяняльную тэхніку [7, с. 85]. Бачна, што наша пазіцыя адносна відаў юрыдычнай тэхнікі перасякаецца з класіфікацыяй юрыдычнай тэхнікі, якая даецца Т.В.Кашанінай. Л.А.Марозава падзяляе юрыдычную тэхніку на заканадаўчую і правапрымяняльную [8, с. 339] без тлумачэння крытэрыяў класіфікацыі.

У.М.Карташоў займае асобную пазіцыю адносна будовы і відаў юрыдычнай тэхнікі. Юрыдычная тэхніка разглядаецца аўтарам у якасці адной з частак катэгорыі «юрыдычная тэхналогія». «Если рассматривать юридическую практику как духовно-материальное производство, – піша У.М.Карташоў, – то ее ядро (основу) составляет, естественно, технология, а юридическая техника представляет собой важнейший компонент последней» [9, с. 18]. Як выглядаюць пры такім падыходзе суадносіны паміж паняццямі «юрыдычная тэхналогія» і «юрыдычная тэхніка»? У.М.Карташоў лічыць, што юрыдычная тэхніка – гэта *інструментальная частка* юрыдычнай тэхналогіі. Юрыдычная тэхніка – гэта сродкі, якія ўжываюцца суб'ектамі і ўдзельнікамі юрыдычнай дзейнасці. У іх склад прафесар У.М.Карташоў уключае *агульнасацыяльныя* сродкі (мову, разнастайныя сацыяльныя нормы і гэтак далей); *тэхнічныя сродкі* (разнастайныя пошукавыя і аналітычныя прыборы, апараты, машыны, матэрыялы); *спецыяльна юрыдычныя сродкі* (юрыдычныя паняцці, тэрміны, навуковыя катэгорыі і законы, прынцыпы, дэфініцыі, прэзумпцыі, фікцыі, канструкцыі, сімвалы і гэтак далей).

***Аналіз прыведзеных поглядаў сведчыць аб тым, што вылучэнне асобных відаў юрыдычнай тэхнікі залежыць ад аўтарскага разумення юрыдычнай тэхнікі і яе складовых частак, таму не варта падзяляць падыходы аўтараў у справе класіфікацыі юрыдычнай тэхнікі на «правільныя і няправільныя». Розныя падыходы да юрыдычнай тэхнікі даюць дадатковыя веды аб змесце гэтай з'явы і дазваляюць выкарыстаць іх у справе далейшага нарматыўнага прававога замацавання юрыдычнага інструментарыя.***

Патрэбна падкрэсліць, што бо́льшая ўвага традыцыйна надаецца праватворчай тэхніцы, асабліва тэхніцы законатворчасці. Тэхніка сістэматызацыі і інтэрпрэтацыі права прыцягвае менш увагі, але тут трэба адзначыць, што яны здаўна знаходзяцца ў полі зроку даследчыкаў, іншая справа, што прыёмы, спосабы, метады сістэматызацыі і інтэрпрэтацыі права не заўсёды вылучаюцца ў якасці самастойных відаў юрыдычнай тэхнікі і не даследуюцца ў сістэмных стасунках з іншымі відамі юрыдычнай тэхнікі. Адносна правапрымяняльнай тэхнікі У.М.Карташоў адзначыў: «*Не повезло» этой разновидности юридической техники ни в отечественной, ни в зарубежной фундаментальных науках....*» [10, с. 18]. Разам з тым, працэс нарматыўнага прававога замацавання інструментарыя правапрымяняльнай тэхнікі мае даўнюю гісторыю і знаёмства з судзебнікамі, статутамі, кодэксамі працэсуальнага права, іншымі крыніцамі права ў сферы рэалізацыі і прымянення права адназначна сведчыць на карысць таго, што правілы правапрымяняльнай тэхнікі знаходзілі замацаванне ў нормах дзеючага права нават раней, чым правілы праватворчай і правасістэматызацыйнай тэхнікі.

### *Крокі да кадыфікацыі юрыдычнай тэхнікі*

Пры дапамозе правілаў юрыдычнай тэхнікі «обеспечивается прямая и обратная связь между гражданами, социальными слоями населения, гражданским обществом в целом, с одной стороны, и государством в лице его правотворческих и правоприменительных органов, с другой стороны» [11, с. 12]. У гэтым бачыцца сацыяльная значнасць юрыдычнай тэхнікі і становіцца зразумелым імкненне да найбольш поўнага нарматыўнага прававога замацавання юрыдычнага інструментарыя. Што патрэбна зрабіць, каб у перспектыве кадыфікаваць юрыдычную тэхніку?

Для адказу на дадзенае пытанне вернемся да больш падрабязнага разгляду правілаў (альбо нормаў) юрыдычнай тэхнікі. Правілы юрыдычнай тэхнікі – гэта, па-першае, прыёмы, спосабы і метады складання тэкстаў прававых актаў і ажыццяўлення юрыдычна значных дзеянняў. Па-другое, гэта правілы выкарыстання матэрыяльных сродкаў юрыдычнай тэхнікі, сярод якіх значнае месца займаюць тэхнічныя нормы. Па-трэцяе, гэта патрабаванні, якія прад'яўляюцца да інтэлектуальных сродкаў юрыдычнай тэхнікі. Па-чацвёртае, гэта парадак выкарыстання юрыдычнага інструментарыя. Правілы юрыдычнай тэхнікі могуць існаваць у вуснай і пісьмовай форме, у форме этычных, палітычных і прававых нормаў, яны выкладаюцца ў форме метадычных рэкамендацый, замацоўваюцца ў крыніцах права – нарматыўных прававых актах, дагаворах нарматыўнага зместу, прававых звычаях і гэтак далей.

***Такім чынам, правілы юрыдычнай тэхнікі падобна таму, як і юрыдычная тэхніка цалкам, маюць разнародны характар і розняцца паміж сабой па змесце, форме выражэння і нарматыўнага замацавання. Замацаванне метадаў, спосабаў і прыёмаў юрыдычнай тэхнікі, патрабаванняў да сродкаў юрыдычнай тэхнікі і найлепшых вопытных узораў стварэння прававых актаў і ажыццяўлення дзеянняў у сферы права ў дзеючым заканадаўстве – вышэйшая форма існавання юрыдычнай тэхнікі.***

Аналіз дзеючага заканадаўства на прадмет замацавання правілаў юрыдычнай тэхнікі сведчыць аб тым, што значная частка правілаў правапрымяняльнай тэхнікі выкладзена ў Грамадзянска-працэсуальным, Гаспадарча-працэсуальным і Крыміналь-

на-працэсуальным кодэксах, Кодэксе аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, Законе аб канстытуцыйным судаводстве. Гэта правілы, якія ўстанаўліваюць патрабаванні да зместу і формы актаў-дакументаў, рэгламентуюць парадак складання прававых актаў, ажыццяўлення актаў-дзеянняў, выкарыстання матэрыяльных сродкаў юрыдычнай тэхнікі і гэтак далей. Частка правілаў праватворчай тэхнікі замацавана ў асобнай главе Закона Рэспублікі Беларусь ад 10 студзеня 2000 года «Аб нарматыўных прававых актах», у асобных дэкрэтах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Прыкладам спецыяльнага заканадаўчага акта, у якім замацоўваецца значная колькасць аднародных правілаў юрыдычнай тэхнікі з'яўляюцца «Правілы падрыхтоўкі праектаў нарматыўных прававых актаў», якія былі зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 жніўня 2003 г. №359. Але часцей за ўсё правілы падрыхтоўкі тэкстаў прававых актаў, ажыццяўлення дзеянняў у сферы права і выкарыстання сродкаў юрыдычнай дзейнасці выкладаюцца ў форме ведамасных інструкцый аб парадку вядзення асобных відаў юрыдычнай дзейнасці. Сярод знешніх формаў замацавання правілаў юрыдычнай тэхнікі шмат метадычных распрацовак, якія маюць рэкамендацыйны характар і іншую ў параўнанні з крыніцамі права ступень абавязковасці. Асобныя правілы юрыдычнай тэхнікі сустракаюцца нават у нарматыўных прававых актах матэрыяльнага права.

Як можна аб'яднаць у адзіным кодэксе аб юрыдычнай тэхніцы такі стракаты набор правілаў юрыдычнай тэхнікі? Найперш варта ажыццявіць падрыхтоўчую працу і інкарпарыраваць усе віды правілаў юрыдычнай тэхнікі ў форме асобнага неафіцыйнага інфармацыйна-прававога рэсурсу, што дазволіць нам убачыць і ацаніць аб'ём гэтай часткі юрыдычнай тэхнікі. Інкарпарацыю можна правесці ў адпаведнасці з тыпамі і відамі юрыдычнай тэхнікі, якія прыведзены ў дадзеным артыкуле, можна выбраць іншую схему. Важна, каб выбраная схема інкарпарацыі дазваляла ахапіць увесь аб'ём правілаў юрыдычнай тэхнікі, якія замацаваны ў дзеючых крыніцах права, актах метадычнага характару і іншых відах актаў. Наступны аналіз дазволіць, па-першае, выдзеліць правілы юрыдычнай тэхнікі, якія з'яўляюцца агульнымі для ўсіх відаў актаў-дакументаў і актаў-дзеянняў, па-другое, убачыць віды і аб'ём спецыяльных правілаў юрыдычнай тэхнікі, па-трэцяе, ацаніць ступень нарматыўнага прававога замацавання агульных і спецыяльных правілаў юрыдычнай тэхнікі. У залежнасці ад вынікаў аналізу можна распрацаваць структуру будучага кодэкса аб юрыдычнай тэхніцы. Кодэкс аб юрыдычнай тэхніцы бачыцца актам комплекснага характару ў тым сэнсе, што ён будзе ўтрымліваць правілы і патрабаванні да ўсіх відаў прававых актаў і актаў-дзеянняў у сферы права, а таксама самыя важныя правілы, якія вылучаюцца да прававых актаў і актаў-дзеянняў асобных тыпаў і відаў. Кадыфікацыя юрыдычнай тэхнікі пацягне за сабой нарматыўнае прававое замацаванне правілаў юрыдычнай тэхнікі, якія маюць сёння рэкамендацыйны характар і замацоўваюцца ў метадычных дакументах.

***Такім чынам, аналіз складу юрыдычнай тэхнікі дазваляе вызначыць сістэмнае адзінства юрыдычнага інструментарыя і вылучыць чатыры тыпы юрыдычнай тэхнікі – праватворчую, рэалізацыйную, сістэматызацыйную і інтэрпрэтацыйную, у кожным з якіх вылучыць асобныя віды.***

У правілах юрыдычнай тэхнікі знаходзяць увасабленне ўсе складовыя часткі юрыдычнай тэхнікі. Калі ў падмурак інкарпарацыі прыёмаў, спосабаў, метадаў складання актаў-дакументаў і ажыццяўлення актаў-дзеянняў, іншых элементаў юрыдычнай тэхнікі пакласці адзначаную тыпалогію, то можна стварыць асобны інфармацыйна-прававы рэсурс, які ахопіць практычна ўвесь аб'ём правілаў юрыдычнай тэхнікі. З дапамогай аналізу можна затым вылучыць патрабаванні, агульныя для ўсіх відаў прававых актаў і актаў-дзеянняў і спецыяльныя для асобных відаў актаў-дакументаў і актаў-дзеянняў. У выніку гэтага аналізу будзе магчыма скласці базу для наступнай кадыфікацыі юрдычнай тэхнікі.

1. Давыдова, М.Л. Теоретические и методологические проблемы понятия и состава юридической техники: автореф. дис. … д-ра юрид. наук: 12.00.01 / М.Л.Давыдова. – Волгоград, 2010. – 50 с.

2. Баранов, В.М. Эссе главного редактора / В.М.Баранов // Юридическая техника. – 2007. – №1. – С. 5–6.

3. Философский энциклопедический словарь / Л.Ф.Ильичев [и др.]. – М.: Сов. Энциклопедия, 1983. – 840 с.

4. Брауде, И.Л. Избранное: Очерки законодательной техники. Некоторые вопросы системы советского права / И.Л.Брауде. – М.: Институт законодательства и сравнительного правоведения при Правительстве Российской Федерации, 2010. – 159 с.

5. Иеринг, Р. Юридическая техника / пер. с нем. Ф.С.Шендорфа / Р.Иеринг. – СПб, 1905. – 128 с.

6. Бибило, В.Н. Понятие юридической техники / В.Н.Бибило // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 4. Правазнаўства. – 2011. – №4. – С. 3–9.

7. Кашанина, Т.В. Юридическая техника: учебник / Т.В.Кашанина. – М.: Эксмо, 2007. – 512 с.

8. Морозова, Л.А. Теория государства и права: учебник / Л.А.Морозова. – Изд. 2-е, перераб., доп. – М.: Изд-во Эксмо, 2007. – 448 с.

9. Карташов, В.Н. Юридическая технология или юридическая техника? Некоторые методологические аспекты исследования / В.Н.Карташов // Юридическая техника. – 2007. – №1. – С. 16–24.

10. Карташов, В.Н. Техника, тактика и некоторые другие элементы правоприменительной технологии / В.Н.Карташов // Актуальные проблемы теории и истории правовой системы общества: сб. науч. тр. – Вып. 11 / отв. ред. проф. В.Н.Карташов; Яросл. гос. ун-т им. П.Г.Демидова. – Ярославль: ЯрГУ, 2012. – С. 3–34.

11. Поленина, С.В. Юридическая техника как социальный феномен в условиях модернизации / С.В.Поленина // Государство и право. – 2011. – №9. – С. 5–14.